**Important Bird Area:** Balota Zvaniec






© В. Малашевич

**Code:** BY016

**Central coordinates:** 55°03' N 24°51' E

**Location:** Brestskaya voblast: Dragichin region, Kobryn region

**Area:** 16225 ha

**IBA Criteria:** A1, B2, B3

**National conservation status:** частка тэрыторыі ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Званец»

**International conservation status:** ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 1998 годзе. Рамсарская тэрыторыя з 2002 г. (крытэрыі 1, 2, 3)

## Site description:

Балотны масіў Званец размешчаны ў міжрэччы Днепра-Бугскага канала і яго прытокаў – Белаазёрскага і Арэхаўскага каналаў. З паўднёвага і паўночна-заходняга боку масіў абмежаваны меліярацыйнымі сістэмамі. Званец – буйнейшае ў Еўропе нізіннае балота мезатрофнага тыпу са шматлікімі адкрытымі мінеральнымі астравамі. Непасрэдна балота, па якім раскіданы астравы розных памераў (ад 0,2 да 10 гектараў), займае 70,2% масіву. На лясы і хмызнякі прыходзіцца 16,2% агульнай плошчы. Параўнанне аэрафотаздымкаў 1950-ых і 1990-ых гадоў сведчыць аб змяншэнні плошчы адкрытых балот і павелічэнні плошчы

лясоў і хмызнякоў.

Вадаёмы з адкрытай вадой прадстаўлены адным возерам і сеткай каналаў. Возера Залескае ў выніку меліяратыўных работ на прылягаючай тэрыторыі моцна абмялела і ператварылася ў дыстрафіруючы вадаём. Дзякуючы значным памерам і размяшчэнню на водападзеле басейнаў Прыпяці і Буга, балотны комплекс уяўляе сабой стабільную экасістэму, якая ў пэўнай ступені не залежыць ад змен на навакольных тэрыторыях. Аснову воднага сілкавання балота састаўляюць грунтовыя воды, вясной і восенню нязначную ролю адыгрываюць атмасферныя ападкі. Істотны ўплыў на гідрарэжым балотнага комплексу аказваюць прылягаючыя да яго меліяратыўныя сістэмы і сетка каналаў, па якіх вада выцякае з балота.

Асноўным відам землекарыстання на тэрыторыі ўгоддзя з’яўляецца сенакос, яго праводзяць амаль на 10% плошчы балотнага комплексу. Мінеральныя астравы выкарыстоўваюцца для вырошчвання прапашных культур, у асноўным, бульбы. Найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваюцца усходняя і заходняя часткі балота (апошняя знаходзіцца за межамі запаведнай тэрыторыі).

Флора ТВП разнастайна. Усяго адзначана 664 віда. У межах балота Званец выяўлена 67 відаў вышэйшых сасудзістых раслін, якія патрабуюць розных форм аховы. Большасць з гэтых відаў знойдзена на мінеральных астравах, якія з’яўляюцца сапраўднымі аазісамі багацейшай, а часта і проста ўнікальнай флоры сярод аднастайнай расліннасці забалочанай прасторы. На тэрыторыі балота растуць 10 рэдкіх для Беларусі і Еўропы раслінных супольнасцей, раней шырока распаўсюджаных на нізінных балотах Палесся.

## Habitats:

Лясы і хмызнякі – 18,1%, нізінныя балоты – 77,4%, лугі – 1,6%, іншыя землі – 2,9%.

## Birds:

Усяго на балоце Званец гняздуецца 110 відаў птушак, 21 з іх занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Асаблівае міжнароднае значэнне тэрыторыя мае для захавання, ў першую чаргу, буйнейшай у свеце папуляцыі вяртлявай чаротаўкі *Acrocephalus paludicola* і іншых відаў, якія знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення: вялікага арляца *Aquila clanga*, дупеля *Gallinagomedia,* вялікага

кулёна *Numenius arquata*. Акрамя гэтага, на тэрыторыі балота гняздуецца значная колькасць шэрых журавоў *Grusgrus*, звычайных (*Porzanaporzana*) і малых (*Porzana parva*) пагонічаў.

## Other animal groups:

На балоце зарэгістравана 32 віды звяроў, 5 – рэптылій, 9 – амфібій, 24 - рыб.

Адзначана 728 відаў членістаногіх. На Званцы упершыню для Беларусі адзначаны павук-аса *Argiopebruennichi*; стракозы *Orthetrumalbistylum* и *Anax parthenope*; матылі *Zygaenaachilleae*, *Z. ephialtes*,*Polyommatuselena, Idaeacararia*.

На тэрыторыі ТВП знойдзена 214 відаў гідрабіёнтаў. Сярод іх тры віда занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі; 27 відаў знойдзены ўпершыню для тэрыторыі Беларусі.

## Populations of IBA trigger species:

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends (1995-2011) | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Greylag goose *Anser anser* | B | 15-20 breeding pairs | 2011 | Good | ↑ | |
| Bittern *Botaurus stellaris* | B | 10-15 males only | 2011 | Good | ↓ | |
| Great white egret *Casmerodius albus* | B | 5-10 breeding pairs | 2011 | Poor | ↑ | |
| Black stork *Ciconia nigra* | B | 1-2 breeding pairs | 2011 | Poor | ↔ | |
| White-tailed eagle *Haliaeetus albicilla* | B | 2 breeding pairs | 2011 | Good | ↔ | |
| Short-toed eagle *Circaetus gallicus* | B | 1-2 breeding pairs | 2000-2004 | Good | ↔ | |

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends (1995-2011) | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Hen harrier *Circus cyaneus* | B | 2-3 breeding pairs | 2000-2004 | Good | ↔ | |
| Lesser spotted eagle *Aquila pomarina* | B | 3-4 breeding pairs | 2000-2004 | Good | ↔ | |
| Spotted eagle *Aquila clanga* | B | 3 breeding pairs | 2010 | Good | ↑ | A1 |
| Osprey *Pandion haliaetus* | P | + | 2000-2010 | Poor | | |
| Kestrel *Falco tinnunculus* | B | + | 2000-2010 | Poor | | |
| Red-footed falcon *Falco vespertinus* | P | + | 2000-2010 | Poor | | |
| Hobby *Falco subbuteo* | B | 2 breeding pairs | 2000-2004 | Good | ↔ | |
| Spotted crake *Porzana porzana* | B | 600-1100 males only | 2011 | Medium | ↓ | B2 |
| Little crake *Porzana parva* | B | 50-80 males only | 2011 | Medium | | B3 |
| Corncrake *Crex crex* | B | 30-40 males only | 2010 | Medium | ↓ | |
| Crane *Grus grus* | B | 20-25 breeding pairs | 2011 | Medium | ↓ | |
| Great snipe *Gallinago media* | B | 2 males only | 2010 | Poor | ↓ | |
| Whimbrel *Numenius phaeopus* | N | + | 2000-2010 | Poor | | |

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends (1995-2011) | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Curlew *Numenius arquata* | B | 10-15 breeding pairs | 2010 | Poor | ↓ | B2 |
| Whiskered tern *Chlidonias hybrida* | N | + | 2000-2010 | Poor | | |
| Eagle owl *Bubo bubo* | B | 1-2 breeding pairs | 2011 | Good | ↔ | |
| Short-eared owl *Asio flammeus* | B | > 5 breeding pairs | 2010 | Poor | ↓ | |
| Kingfisher *Alcedo atthis* | B | + | 2000-2010 | Poor | | |
| Aquatic warbler *Acrocephalus paludicola* | B | 2033-6974 males only | 2011 | Medium | ↓ | A1 |
| Azure tit *Cyanistes cyanus* | B? | 0-3 breeding pairs | 2011 | Poor | | |

## Other biodiversity:

Звяры: барсук *Melesmeles*, рысь *Lynxlynx.*

Амфібіі: грабеньчаты трытон*Trituruscristatus.*

Рэптыліі: балотная чарапаха *Emysorbicularis.*

Насякомыя:гламерыс звязаны*Glomerisconnexa,* каромысел зялёны*Aeschnaviridis* , жужаль фіялетавы*Carabusviolaceus*, жужаль менетрые*Carabusmenetriesi*, жужаль бліскучы*Carabusnitens*, плавунец найшырэйшы*Dytiscuslatissimus*, падвадзень двухплосы*Graphoderusbilineatus*, мнемазіна*Parnassiusmnemosyne*, шашачніца вялікая*Euphydryasmaturna.* зеленаватая стрэлка *Coenagrionarmatum*, прыгожая

нехаленія *Nehalenniaspeciosa*, сфагнавы вадамер*Gerrissphagnetorum*.

Расліны: венерын чаравічак сапраўдны *Cypripediumcalceolus*, зубніца клубняносная*Dentariabulbifera,* гарычка крыжападобная *Gentianacruciata,* касач сібірскі*Irissibirica,* тайнік яйцападобны*Listeraovata*, гарлачык белы *Nymphaeaalba,* цыбуля мядзведжая*Alliumursinum,* пальчатакарэннік майскі*Dactylorhizamajalis,* шпажнік чарапіцавы*Gladiolusimbricatus,* асака ценявая*Carexumbrosa,* пухірнік ягадны*Cucubalusbaccifer,* вярба чарнічная*Salixmyrtilloides,* увярэднік скіпетрападобны*Pedicularissceptrum-carolinum,* ядрушка даўгарогая*Gymnadenia conopsea,* верабейнік лекавы*Lythospermumofficinale,* святаяннік чатырохкрылы *Hypericumtetrapterum,* асака дэвела*Carexdavalliana,* пылкагалоўнік чырвоны *Cephalanterarubra,* лопух дуброўны*Arctiumnemorosum,* гарычка крыжападобная *Gentianella amarella,* зубнік мяккі *Crepis mollis,* пылкагалоўнік чырвоны *Cephalanthera rubra,* асака балоталюбівая *Carex heleonastes,* падвей стройны *Eriophorum gracile.*

## Threats:

- Парушэнне гідралагічнага рэжыму балотнага масіву.
- Узворванне глебы на мінеральных астравах, дзе растуць рэдкія віды раслін.
- Скарачэнне сенакашэння з’яўляецца асноўнай прычынай зарастання адкрытых нізінных балот хмызнякамі.
- Няўстойлівае лесакарыстанне. Лесакарыстанне на тэрыторыі заказніка праводзіцца без уліку яго значнасці для захавання біяразнастайнасці.
- Штогоднае выпальванне расліннасці ў вясенні перыяд практыкуецца мясцовым насельніцтвам і наносіць істотную шкоду біялагічнай разнастайнасці. Асабліва буйныя пашкоджанні адбываюцца ва ўмовах сухой вясны і адсутнасці паводак, калі разам з расліннасцю выпальваецца верхні слой глебы, карэнні раслін і гінуць усе насякомыя. На такіх выпаленых балотах і лугах большасць птушак перастае гнездавацца.

## Recommendations for the conservation:

У 2001 годзе распрацаваны план кіравання заказнікам «Званец», які ўтрымлівае рэкамендацыі па вырашэнню большасці пералічаных вышэй праблем. Асноўная ўвага ў плане ўдзелена аднаўленню гідралагічнага рэжыму, правядзенню спецыяльнага лесаўпарадкавання, укараненню прынцыпаў экалагічнага прыродакарыстання.

## References:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч., Кальчанка А.І., Левы С.В., Малашэвіч У.У.

План управления республиканским ландшафтным заказником «Званец» (разработан ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам», 2009).

Дубовик Д.В., Скуратович А.Н. Болото Званец – уникальный природный комплекс Белорусского Полесья. // Растительность болот: современные проблемы классификации, картографирования, использования и охраны. Материалы международного научно-практического семинара. – Минск: Право и экономика, 2009., с. 156-158.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Вяргейчык Л.А., Грычык В.В., Дамброўскі В.Ч., Дзмітранок М.Г., Дэмангін Л., Казулін А.В., Парэйка А.А., Скуратовіч А.М., Сцепановіч Я.М., Фладэ М.).

Отчет по по НИР на тему«Проведение учётов индикаторных видов животных в заказниках «Споровский», «Званец», «Средняя Припять» и «Простырь». Науч. руководитель Карлионова Н.В., Минск., 2010. – 56 с.

**Authors :** Кальчанка А.І., Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*